*С.А. Гур'еў*
*БДУ (Мінск)*

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ Ў ПЕРШЫХ САВЕЦКІХ КРЫМІНАЛЬНЫХ КОДЭКСАХ

З першых дзён свайго існавання савецкая ўлада сутыкнулася са значным супраціўленнем. Разам з узброенай барацьбой бальшавікі пачалі прымяняць крымінальна-прававыя метады ўмацавання сваёй улады. Галоўнай задачай крымінальнага заканадаўства абвяшчалася ахова савецкай дзяржавы. Дзяржаўныя злачынствы лічыліся самымі небяспечнымі і ім належала галоўная роля ў першых савецкіх крымінальна-прававых нарматыўных актах.

Пасля ўтварэння Беларускай ССР права пачало грунтавацца на расійскіх законах і на рэвалюцыйнай правасвядомасці. Суддзі часам самі вызначалі крымінальнасць дзеяння, від і памер пакарання. Самым пашыраным пакараннем за злачынствы супраць дзяржавы ў гэты перыяд быў расстрэл. Адбываўся «чырвоны тэрор» і масавыя пазасудовыя расправы.

24 мая 1922 г. быў прыняты Крымінальны кодэкс (КК) РСФСР. Яго дзеянне было распаўсюджана і на Беларусь. Асаблівая частка ўключала главу аб дзяржаўных (контррэвалюцыйных і супраць парадку кіравання) злачынствах. Увогуле злачынствам гэтай катэгорыі была прысвечана амаль трэць з 171 артыкула Асаблівай часткі КК, што сведчыць аб іх вялікім значэнні. За ўчыненне контррэвалюцыйных дзеянняў закон прадугледжваў пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў, вышэйшую меру пакарання — расстрэл і канфіскацыю ўсёй маёмасці. За злачынствы супраць парадку кіравання таксама прымяняўся штраф і прымусовыя працы. Хаця максімальны тэрмін пазбаўлення волі за ўказаныя злачынствы быў невялікі, 10 з 17 артыкулаў КК аб контррэвалюцыйных злачынствах прадугледжвалі расстрэл. Да контррэвалюцыйных дзеянняў адносіліся: арганізацыя збройных паўстанняў, здзяйсненне тэрарыстычных актаў супраць савецкай улады, шпіянаж, барацьба супраць працоўнага класу, прапаганда і агітацыя да звяржэння ўлады Саветаў, выраб і захаванне агітацыйнай літаратуры контррэвалюцыйнага характару, распаўсюджванне ў контррэвалюцыйных мэтах ілжывых чутак і звестак, дапамога замежнай буржуазіі.

У 1926 г. быў прыняты другі КК РСФСР. У арт. 58 распавядалася пра контррэвалюцыйныя злачынствы. У адрозненне ад папярэдняга Кодэкса тэрмін «пакаранне» замяняўся тэрмінам «мера сацыяльнай аховы», хаця сутнасць ад гэтага не мянялася. З'явіліся

такія новыя віды пакаранняў, як аб'яўленне ворагам працоўных з выгнаннем за межы СССР.

На падставе Крымінальнага закона РСФСР ад 23 верасня 1928 г. быў прыняты ўласны Крымінальны кодэкс БССР (далей — КК БССР). У Законе адсутнічала падзяленне на Агульную і Асаблівую часткі, і першыя 4 раздзелы ў асноўным узнаўлялі нормы агульнасаюзнага заканадаўства. У Кодэксе, у адрозненне ад папярэдняга, контррэвалюцыйныя злачынствы і злачынствы супраць парадка дзяржаўнага кіравання выдзяляліся ў асобныя раздзелы. Злачынствы супраць парадка дзяржаунага кіравання падзяляліся: на злачынствы супраць парадка дзяржаўнага кіравання, асабліва небяспечныя для СССР, і іншыя злачынствы супраць парадка кіравання. Перавага аддавалася крымінальна-прававой абароне дзяржаўных інтарэсаў. Аб гэтым сведчыць не толькі структура КК, але і змест першага артыкула, дзе гаварылася, што КК БССР мае сваёй задачай судова-прававую абарону сацыялістычнай дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ад грамадска-небяспечных дзеянняў (злачынствау) шляхам прымянення да правапарушальнікаў (злачынцаў), указаных у КК мераў сацыяльнай абароны. Крымінальны кодэкс БССР 1928 г. дапускаў прымяненне аналогіі закону. У арт. 5 КК БССР 1928 г. давалася класіфікацыя злачынствау на падставе палітычных крытэрыяў. Злачынствы супраць асноу савецкага ладу караліся больш жорстка за іншыя.

Такім чынам, на этапе пабудовы савецкай дзяржавы найбольшая увага у крымінальным заканадаўстве надавалася сродкам барацьбы з дзяржаўнымі злачынствамі. Крымінальныя кодэксы 1920-х гг. XX ст. былі першай спробай савецкай улады надаць законнасць барацьбе з усялякім іншадумствам. Гэтая тэндэнцыя працягвалася і далей. Наступныя крымінальныя законы насілі рэпрэсіўны характар у адносінах да так званых «здраднікаў радзімы», нават уводзілася крымінальная адказнасць для сямей асоб, абвінавачаных у дзяржаўных злачынствах.

***Н.В. Гучок, Е.П. Тихонова***

*БГЭУ (Минск)*

## «ПРАВО МЕНЬШИНСТВА» Г. ЕЛЛИНЕКА

Рост сепаратистских настроений, террор, массовые нарушения прав человека, совершаемые под предлогом защиты тех или иных этнических групп, заставляют вновь и вновь обращаться к теме национальных меньшинств, составляющей часть более общего вопроса о взаимоотношениях большинства и меньшинства.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by